

А. Салятыцкі. Помнік ахвярам фашызму ў в. Гліняны Гродзенскага раёна. Фрагмент. Бетон, сілумін. 1982.

бышаву ў Гродне (1975), І. Ю. Філідовічу ў г. п. Дзятлава (1980), ахвярам фашызму ў в. Гліняны Гродзенскага р-на (1982), мемар. знакі настаўнікам і вучням СШ № 1 г. Гродна, якія загінулі ў Вял. Айч. вайну (1981), С. К. Камышаву ў в. Заполле Навагрудскага р-на (1982). Выканаў дэкар. свяцільню ў інтэр'еры Гродзенскага абл. драм. тэатра (1983, у сааўт.).

**САМАДЗЕЙНАЕ ВЫЯЎЛЕНЧАЕ І ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОЕ МАСТАЦТВА,** аматарская творчасць народных мас у галіне жывапісу, скульптуры, графікі і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Асабліва росквіту дасягнула ў СССР і краінах сацыяліст. садружнасці. Займае важнае месца ў духоўным развіцці грамадства як структурны элемент маст. культуры; эфектыўная форма культ.-асв. работы, ідэйнага і эстэт. выхавання працоўных, фарміравання гарманічна развітой асобы. Існуе ў арганізаваных (студыі, клубы, гурткі пры Палацах і Дамах культуры, Палацах і Дамах піянераў і школьнікаў, навучальных установах і інш.) і неарганізаваных формах.

На Беларусі ў першыя гады Сав. улады ствараліся гурткі і студыі пры заводах і фабрыках, установах, часцях Чырв. Арміі. Творчасць народа атрымала агітацыйна-прапагандысцкую накіраванасць. Многія мастакі-аматары сталі актыўнымі ўдзельнікамі ажыццяўлення Ленінскага плана манументальнай прапаганды. Шэраг работ быў прысвечаны вобразу У. І. Леніна (бюст, створаны каменшчыкам І. Барысевічам з Дзяржынска, выразаны па дрэве партрэт работы Б. Хрушчова, які экспанаваўся ў 1930 у гал. павільёне Бел. с.-г. выстаўкі ў Маскве). Мастакі-аматары стварылі бюсты выдатных паліт. і грамадскіх дзеячаў, помнікі, якія ўслаўлялі свабодную працу, актыўна працавалі над афармленнем вуліц і плошчаў, агітпаяздоў, агітпараходаў, агітпавозак (агітпараход і агітпоезд на Гомельшчыне ў 1919, мінскі агітпоезд на Віцебшчыне ў 1934); на месцах прыпынку цягніка ці парахода ўдзельнікамі агітрэйдаў ствараліся новыя агітплакаты, лозунгі, разгортваліся маст. выстаўкі. У 1920-я г. праводзілася значная работа па паладжванню навуч. працэсу ў галіне самадз. выяўл. мастацтва. У Гомелі ў 1919—21 працавалі: студыя выяўл. мастацтва імя М. А. Урубеля (сярод яе выхаванцаў нар. мастак РСФСР Г. Ніскі), студыя пры Чангарскай кавалерыйскай дывізіі, студыя скульптуры пад кіраўніцтвам выпускніка Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў Ф. Валяро. У 1920-я г. былі створаны студыі выяўл. мастацтва ў Мінску, Оршы, Полацку, Гарадку. На выстаўцы твораў С. в. і д.-п. м. (1919) экспанаваліся работы рамеснікаў і мастакоў Бабруйска. З асобных відаў дэкар.-прыкладнога мастацтва ў 1920—30-я г. развіваліся пераважна разьба па дрэве, аплікацыя саломкай, размалёўка, вышыўка, лозапляценне, кераміка. У 1936 у Мінску адбылася вы-



І. Абравец. Цэнтральная частка трыпціха «Хлеб». Алей. 1982.



Л. Галаенка. Бацькі. Алей. 1983.



Н. Ганчарова. Бабуліна восень. Алей. 1983.

стаўка работ самадз. мастакоў, у 1937 і 1938 — выстаўкі самадз. і нар. мастацкай творчасці. Развіццю С. в. і д.-п. м. садзейнічалі створаныя ў канцы 1930-х г. Дамы нар. творчасці (з 1979 *Навукова-метадычныя цэнтры народнай творчасці і культурна-асветнай работы*). У гады Вял. Айч. вайны самадз. мастакі прымалі актыўны ўдзел у выданні і афармленні друкаваных і рукапісных *падпольных перыядычных выданняў* на Беларусі, змяшчалі ў іх партрэты нар. мсціўцаў, пейзажныя замалёўкі, сатыр. малюнкі, якія і сёння з'яўляюцца невычэрпнай крыніцай ваенна-патрыятычнага выхавання моладзі, усяго сав. народа. У 1940—50-я г. С. в. і д.-п. м. атрымалі сваё далейшае развіццё. Гэты час характарызаваўся арганізацыяй значнай колькасці новых студый і гурткоў, правядзеннем творчых семінараў самадз. мастакоў, актывізацыяй выставачнай дзейнасці. У 1947, 1952, 1959 адбыліся рэсп. выстаўкі самадз. і нар. мастацкай творчасці, у 1955 выстаўка на Дэкадзе бел. мастацтва і л-ры ў Маскве. Значнае месца ў творчасці мастакоў-аматараў займалі тэмы Вял. Айч. вайны, адраджэння нар. гаспадаркі, роднага краю. У 1960—70-я г. актывізавалася дзейнасць арганізацыйна-метадычных устаноў. У 2-й пал. 1960-х г. былі



І. Кішкурна. Нацюрморт. Алей. 1983.



Б. Тарасенка. На палескіх прасторах. Алей. 1984.



В. Аляксеенка. Сцяг Перамогі над рэйхстагам. Алей. 1984.



Л. Трахалёва. Дот. Алей. 1984.

створаны Дамы маст. самадзейнасці (з 1978 міжсаюзныя *Дамы самадзейнай творчасці*). Студыі і клубы самадз. мастакоў і майстроў дэкар.-прыкладнога мастацтва сталі сапраўднымі цэнтрамі прапаганды маст. культуры і эстэт. выхавання працоўных. На 1.1.1987 у рэспубліцы ў культ.-асветных установах Мін-ва культуры БССР і Белсаўпрофа больш за 800 маст. гурткоў і студый выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва, у якіх займаецца больш за 12 тыс. чал. (дарослых і дзяцей), 29 студый маюць званне народных і ўзорных (гл. *Народныя студыі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*). Значны ўплыў на развіццё бел. С. в. і д.-п. м. зрабіў удзел бел. самадз. мастакоў і майстроў дэкар.-прыкладнога мастацтва ў рэсп. і ўсесаюзных фестывальных выстаўках-конкурсах, прысвечаных 50-годдзю Кастр. рэвалюцыі (1967), 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна (1970), 50-годдзю (1972) і 60-годдзю ўтварэння СССР (1982), рэсп. і ўсесаюзнай выстаўцы нар. і самадз. выяўл. творчасці «Слава працы» (1973), рэсп. выстаўцы самадз. дэкар.-прыкладнога і выяўл. мастацтва, прысвечанай XXVIII з'езду КПБ (1976), рэсп. выстаўцы (1976), 1-м Усесаюзным фестывалі самадз. маст. творчасці працоўных (1975—77), усесаюзнай выстаўцы «Самадзейныя мастакі — Радзіме» (1977), рэсп. выстаўцы дзіцячай вы-



І. Занковіч. Кашы. Лаза. 1983.





В. Гаўрылюк. Пава. Саломка. 1984 (злева); С. Какшынскі. Дзядок. Шамот. 1980-я г.



А. Вярыга. Жалейка. Разьба па дрэве. 1984.

яўл., дэкар.-прыкладной і тэхн. творчасці, прысвечанай Міжнар. году дзіцяці (1979), усесаюзнай выстаўцы самадз. выяўл. і дэкар.-прыкладнога мастацтва (1981), «40 год Вялікай Перамогі» (1985). Творчасці самадз. мастакоў і майстроў дэкар.-прыкладнога мастацтва 1970—80-х г. уласцівы разнастайнасць манер і тэхніка-выканаўчых прыёмаў, актыўны пошук індывід. формы, шырыня жанрава-тэмат. дыяпазону, паўната адлюстравання сучаснага жыцця. У творах самадз. мастакоў і скульптараў усё мацней гучаць тэмы высокага грамадз. зместу. Значнае месца ў *драўлянай скульптуры* занялі фалькл. матывы. Сярод вядомых майстроў С. в. і д.-п. м. Беларусі 1960—80-х г. І. Абравец, Т. Агафоненка, В. Альшэўскі, В. Аляксеенка, Л. Галаенка, Ф. Генкін, П. Гольцаў, У. Гулякевіч, Ф. Дудо, М. Ерафееў, І. Кішкурна, М. Корабаў, В. Самойленка, С. Серак (Мінск), В. Бусараў, Н. Ганчарова, Г. Ганчаронак, П. Гатоўка,



П. Букасаў. Дзеці вайны. Алей. 1980.

І. Занковіч, С. Какшынскі, М. Няхай, А. Пупко, Дз. Сырамятнікаў, В. Рудовіч (Мінская вобл.), В. Гаўрылюк, В. Дабракващын, Дз. Цубер (Брэсцкая вобл.), Г. Асіпкова, А. Вярыга, Дз. Крупеня, А. Міхеенка, Ф. Сухавіла, С. Шаўроў, А. Шышанкоў (Віцебская вобл.), М. Засінец, Б. Тарасенка (Гомельская вобл.), С. Бык, В. Кандрацэнка, Л. Трахалёва (Гродзенская вобл.), К. Арцёменка, П. Букасаў, В. Гвоздзеў (Магілёўская вобл.) і інш. Лепшыя работы экспануюцца на ВДНГ СССР у Маскве, ВДНГ БССР у Мінску, былі паказаны на міжнар. выстаўках у НРБ, ВНР, ГДР, МНР, ПНР, ЧССР, на Кубе, у Бельгіі, Вялікабрытаніі, ЗША, Італіі, Фінляндыі, Францыі і інш. Іл. гл. таксама на ўкл. да гэтага арт., у арт. *Дзіцячая творчасць*, *Скульптура малых форм* і на ўкл. да яго. *Р. Ф. Шаура.*

**САМАДЗЕЙНАЕ МАСТАЦТВА**, аматарская творчасць народных мас у галіне выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога, музычнага, тэатральнага, харэаграфічнага і цыркавога мастацтваў, кінамастацтва, фатаграфіі і інш. Асаблівага росквіту дасягнула ў СССР, дзе развіваецца ў рэчышчы агульнай маст. культуры і адлюстроўвае рост эстэт. запатрабаванняў працоўных. Вытокі С. м. ў *народнай творчасці*. Існуе пераважна ў арганізаваных (самадз. калектывы пры Палацах і Дамах культуры, Палацах і Дамах піянераў і школьнікаў, навучальных установах і інш.), а таксама ў неарганізаваных (асобныя мастакі, скульптары, фота- і кінааматары) формах. Пра развіццё асобных відаў гл. *Самадзейнае выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*, *Самадзейнае музычнае мастацтва*, *Самадзейнае тэатральнае мастацтва*, *Самадзейнае харэаграфічнае мастацтва*, *Аматарскае кіно*, *Фотамастацтва*, *Народныя студыі выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва*, *Народныя і ўзорныя тэатры*, *Народныя і ўзорныя хоры, ансамблі і аркестры*, *Народны цыркавы калектыў*.

**САМАДЗЕЙНАЕ МУЗЫЧНАЕ МАСТАЦТВА**, аматарская творчасць нар. мас у галіне музыкі. Ахоплівае індывід. і калектыўнае выкананне вакальнай і інстр. музыкі, а таксама стварэнне муз. твораў аматарамі. Вытокі бел. муз. самадзейнасці ў бытавых і абрадавых карагодах і гульнях, у валачобных, калядных і вясельных гуртах, якія рыхтаваліся загадзя.

З 1830—40-х г. на Беларусі пашырылася аматарскае музіцыраванне ў гарадскім асяроддзі, спачатку дваранскім (муз. спектаклі, у т. л. па першых вадэвілях і муз. камедыях С. Манюшкі, камерныя вечары і інш.), потым і больш дэмакратычным. У 2-й пал. 19 ст. яно набыло арганізаваныя формы (хоры настаўніцкіх семінарый з 1864, *музычныя таварыствы* з 1880-х г.). Этапам у развіцці С. м. м. былі *беларускія вечарынкі* (з 1905), што наладжваліся муз.-драм. гурткамі.

У сав. час маст. самадзейнасць атрымала сапраўдны размах, стала адной з асн. форм раскрыцця здольнасцей тых, для каго мастацтва не з'яўляецца прафесіяй. У першыя пасля Кастр. рэв. гады надзённую патрэбу шырокіх нар. мас у далучэнні да актыўнага музіцыравання паказала дзейнасць хораў і аркестраў *народных кансерваторый*. У 1920-я г. ў стварэнні рэпертуару для ка-